ПАЛАЖЭННЕ
аб правядзенні Рэспубліканскай выставы-конкурсу
дэкаратыўна-прыкладной творчасці
“Саматканы цуд”

1. Палажэнне аб правядзенні Рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд” (далей – выстава-конкурс) распрацаваны ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку правядзення рэспубліканскіх мерапрыемстваў установамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі з удзелам навучэнцаў, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 06.07.2011 № 59.

2. Выстава-конкурс праводзіцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь ва ўзаемадзеянні з установай адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (далей – Нацыянальны цэнтр).

3. Выстава-конкурс праводзіцца з мэтай патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны; прыцягнення ўвагі дзяцей і творчай моладзі праз сродкі візуальнага мастацтва да народных мастацкіх рамёстваў, традыцыйнага і сучаснага мастацкага тэкстылю; развіцця дзіцячай творчасці ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва; выяўлення і падтрымкі юных талентаў; матывацыі педагогаў дадатковай адукацыі да ўдасканалення свайго прафесійнага майстэрства і інавацыйнага пошуку ў галіне дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

4. Інфармацыя аб правядзенні рэспубліканскай выставы-конкурсу размяшчаецца на афіцыйным сайце Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі не пазней чым за месяц да пачатку яе правядзення.

5. У выставе-конкурсе прымаюць удзел навучэнцы ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (цэнтраў, палацаў), устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку тых, у якіх рэалізуюцца факультатыўныя заняткі мастацкай накіраванасці (далей – установы адукацыі). Узроставая катэгорыя ўдзельнікаў конкурсу: ад 6 да 18 гадоў.

6. Выстава-конкурс праводзіцца з верасня 2024 года па сакавік 2025 года ў чатыры этапы з вызначэннем пераможцаў і прызёраў другога і трэцяга этапаў:

першы этап (адборачны) – праводзіцца ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і ўстановах адукацыі;

другі этап (адборачны) – раённы, раённы для гарадоў, якія маюць раённае дзяленне, гарадскі (акрамя г. Мінска);

трэці этап (адборачны) – абласны, Мінскі гарадскі;

чацвёрты этап (заключны) – рэспубліканскі – праводзіцца ў лютым 2025 года.

7. Тэрміны правядзення першага, другога, трэцяга этапаў выставы-конкурсу вызначаюцца ўстановамі адукацыі, адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі.

8. На кожным этапе выставы-конкурсу ствараюцца арганізацыйныя камітэты па іх правядзенні (далей – аргкамітэты):

на першым этапе – кіраўніком установы адукацыі;

на другім, трэцім этапах – адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы адукацыі;

на заключным этапе – Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Аргкамітэт узначальвае старшыня. Аргкамітэты зацвярджаюць журы адпаведнага этапу. У склад журы ўваходзяць прафесійныя мастакі, мастацтвазнаўцы, выкладчыкі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

9. Арганізатары выставы-конкурсу маюць права на апрацоўку персанальных звестак удзельнікаў (публікацыю спісаў пераможцаў, выданне дыпломаў, афіш, буклетаў і г.д.). Прадастаўленне творчых работ на выставу-конкурс азначае аўтаматычную згоду ўдзельніка і яго афіцыйнага прадстаўніка з умовамі выставы-конкурсу і з правам арганізатара на апрацоўку персанальных даных.

10. Да ўдзелу ў заключным этапе выставы-конкурсу ў рэспубліканскі аргкамітэт да 26 студзеня 2025 года абласным і Мінскаму гарадскому аргкамітэтам неабходна прадставіць:

заяўку на ўдзел у заключным этапе рэспубліканскай выставы-конкурсу (дадатак 1);

маніторынг удзелу ў выставе-конкурсе (дадатак 3);

выпіску з пратакола рашэння абласных (Мінскага гарадскога) аргкамітэтаў па выніках абласных (г. Мінск) этапаў выставы-конкурсу;

інфармацыйныя матэрыялы конкурсу на беларускай мове (каталожныя дадзеныя, заяўка) па электроннай пошце ddp@nchtdm.by з паметкай “Саматканы цуд”;

70 лепшых работ у Рэспубліканскі арганізацыйны камітэт па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. Кірава, 16, Нацыянальны цэнтр. Даведкі па тэл.: (017) 364 21 97.

11. На выставу-конкурс прымаюцца індывідуальныя і калектыўныя работы, розныя па тэматыцы, кампазіцыі і тэхніцы выканання, традыцыйнага і сучаснага напрамку: ткацтва; вышыўка; народныя лялькі, лялькі ў нацыянальным строі; беларускі традыцыйны рэгіянальны касцюм, яго элементы і інтэрпрэтацыі; лямец; тэкстыльная

аўтарская лялька; тэкстыльны арт-аб’ект (аб’ёмныя абстрактныя работы).

На зваротным баку кожнай работы абавязкова размяшчаюцца каталожныя дадзеныя, дзе ўказваецца назва работы; прозвішча, імя і ўзрост аўтара; назва аб’яднання па інтарэсах; прозвішча, імя, імя па бацьку педагога дадатковай адукацыі; поўная назва ўстановы (гл. дадатак 1).

Работы павінны быць творчымі і арыгінальнымі ў тэматычным плане, у эксперыментаванні з матэрыялам, мець яркае і выразнае раскрыццё вобразаў; выкананы акуратна, згодна з тэхналогіямі, у адпаведнасці з кампазіцыйнымі асаблівасцямі.

12. Выстава-конкурс праводзіцца ў наступных намінацыях: “Вышыўка”, “Ткацтва”, “Габелен”, “Лямец”, “Вязанне”, “Традыцыйная лялька”, “Сучасная лялька”, “Нацыянальны касцюм”, “Тэкстыльны каллаж”, “Арт-аб’ект”.

Пераможцы і прызёры выставы-конкурсу вызначаюцца ў трох узроставых катэгорыях: 6–9 гадоў, 10–13 гадоў, 14–18 гадоў.

13. Па выніках работы журы рэспубліканскага этапу выставы-конкурсу вызначаюцца пераможцы і прызёры ў адпаведнасці з намінацыямі і ўзроставымі катэгорыямі ўдзельнікаў.

14. Работы ацэньваюцца ў адпаведнасці з крытэрыямі згодна з дадаткам 2 да дадзеных умоў.

Журы пакідае за сабой права на вызначэнне колькасці прызавых месцаў у намінацыях (колькасць прызавых месцаў можа быць павялічана або зменшана).

15. Пераможцы і прызёры заключнага этапу выставы-конкурсу ў кожнай намінацыі і ўзроставай катэгорыі ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступені Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Усе ўдзельнікі Рэспубліканскай выставы-конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд” узнагароджваюцца дыпломамі Нацыянальнага цэнтра.

16. Работы пераможцаў і прызёраў выставы-конкурсу застаюцца ў рэспубліканскім выставачным фондзе, арганізацыйны камітэт выставы-конкурсу пакідае за сабой права дэманстраваць работы на мерапрыемствах некамерцыйнага характару.

17. Інфармацыя аб правядзенні і выніках выставы-конкурсу будзе размешчана на сайце Нацыянальнага цэнтра мастацкай творчасці дзяцей і моладзі www.nchtdm.by, а таксама будзе прадстаўлена ў сродках масавай інфармацыі.

18. Фінансаванне раённых і абласных этапаў выставы-конкурсу ажыццяўляецца ў межах сродкаў мясцовага і абласнога бюджэту і іншых сродкаў, не забароненых заканадаўствам.

19. Фінансаванне заключнага этапу выставы-конкурсу ажыццяўляецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у межах сродкаў рэспубліканскага бюджэту, што выдзяляюцца на цэнтралізаваныя мерапрыемствы ў галіне адукацыі (друкарскія выдаткі: афішы, дыпломы; аплата журы і г.д.), і іншых сродкаў, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

20. Выдаткі па дастаўцы экспанатаў на выставу-конкурс, камандзіровачныя выдаткі асоб нясуць арганізацыі, якія накіроўваюць прадстаўнікоў устаноў адукацыі для ўдзелу ў выставе-конкурсе.

Дадатак 1
да Палажэння аб правядзенні
выставы-конкурсу

Заяўка да ўдзелу ў Рэспубліканскай выставе-конкурсе
дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”

| № п/п | Назва работы | Прозвішча, імя аўтара, узрост | Назва аб’яднання па інтарэсах | Прозвішча, імя, імя па бацьку педагога | Назва ўстановы |
|---|---|---|---|---|---|
| Намінацыя “Вышыўка” | | | | | |
| 1 | “Конь” | Іваноў Іван, 15 гадоў | аб’яднанне па інтарэсах “Спадчына” | Паўлавец Вольга Мікалаеўна | ДУА “Брэсцкі цэнтр дзіцячай творчасці” |

Прыклад афармлення каталожных дадзеных

“Вясна”
**Бандарэнка Дзіяна, 10 гадоў**
аб’яднанне па інтарэсах
“З кветкамі праз стагоддзі”
педагог Бандарэнка Вольга Вітальеўна
ДУА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі
“Крэчут” г. Крычава”

Дадатак 2
да Палажэння аб правядзенні
выставы-конкурсу

Крытэрыі ацэнкі конкурсных работ
Рэспубліканскай выставы-конкурсу
дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”

| **№ п/п** | **Крытэрыі** | **Балы** |
|---|---|---|
| 1. | Захаванне беларускіх народных рамёстваў | от 0 до 10 |
| 2. | Кампазіцыйнае і каляровае рашэнне | от 0 до 10 |
| 3. | Адзінства стылявога, мастацкага і вобразнага рашэння работы | от 0 до 10 |
| 4. | Арыгінальнасць ідэі, самабытнасць мастацкага ўвасаблення | от 0 до10 |
| 5. | Спалучэнне традыцыйнай творчасці і сучаснай культуры | от 0 до10 |
| 6. | Выкарыстанне новых тэхнік і тэхналогій у творчых работах | от 0 до10 |
| **Максімальная колькасць балаў** | | **60** |

Дадатак 3
да Палажэння аб правядзенні
выставы-конкурсу

Маніторынг удзелу
ў Рэспубліканскай выставе-конкурсе
дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Саматканы цуд”
_______________вобласць

| *ЭТАПЫ* | Колькасць прадстаўленых работ усяго / з іх УДАДіМ | Колькасць аб’яднанняў па інтарэсах усяго / з іх УДАДіМ | Колькасць удзельнікаў усяго / з іх УДАДіМ | Колькасць устаноў усяго / з іх УДАДіМ |
|---|---|---|---|---|
| Раённы (гарадскі) этап | | | | |
| Абласны этап | | | | |